Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

Вікторыя Уласевіч
Мінск

Спосабы адаптацыі новай запазычанай лексікі ў беларускай і польскай мовах

The ways of adaptation of the new loan words in Belarusian and in Polish

Значныя пераўтварэнні ў грамадска-палітычным, эканамічным і культурным жыцці Беларусі і Польшчы канца XX – пачатку XXI ст. выклікалі істотныя змены ў лексічным складзе беларускай і польскай моў. Пры наяўнасці агульных тэндэнцый пры ўзнікненні лексічных інавацый у беларускай і польскай мовах, гэтыя працэсы пад уплывам экстра- і інтралінгвістычных фактараў у кожнай з моў маюць сваю спецыфіку.

Слоўнікавы склад абедзвюх моў у гэты час вельмі пашырыўся, у тым ліку за кошт значнай колькасці запазычанняў, найперш з англійскай мовы і яе амерыканскага варыянта. Запазычанні належаць да самых розных сфер жыцця сучаснага грамадства: палітыкі (бел. *інаўгурацыя, істэблішмент, нонканфармізм, саміт, электарат*; польск. *establishment, electorat, opozycja, prezydencja, autorytarny*), эканомікі і фінансаў (бел. *авердрафт, аўтсорсінг, дэмпінг, кансалтынг, мерчандайзінг, франчайзінг;* польск. *audit, dealer, denominacja, franchising, holding,*), сферы інфармацыйных тэхналогій (бел. *банер, блютуз, браўзер, інтэрфейс, плагін*; польск. *bajt, notebook, kursor, server, software, czat*), быту (бел. *блэндар, памперсы, сайдынг, мостар, фаст-фуд*; польск. *chipsy, drink, hot dog, klimatyzacja, puzzle*), культуры і шоу-бізнесу (бел. *бук-арт, глэм-рок, грандж, копі-арт, хіп-хоп*; польск. *clip, reality show, singel, remake, sitcom*[1]) і інш.

Даследчыкі па-рознаму ацэньваюць працэсы папаўнення слоўнікавага складу мовы за кошт запазычанняў: ад поўнага непрыняцця да суцэльнага ўхвалення. Аднак ацэначны падыход у лінгвістыцы не заўсёды прымальны, бо ён не да-

[1] Прыклады беларускіх лексем узяты з выдання: В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч, *Слоўнік новых слоў беларускай мовы*, Мінск 2009 (далей – СНС); польскіх – з выданняў: A. Markowski, *Leksykon najnowszych wyrazów obcych używanych w prasie, radiu i telewizji*, Warszawa 1997 (далей – LNW); *Nowy słownik języka polskiego PWN*, Warszawa 2002 (далей – PWN); *Słownik wyrazów obcych*, red. I. Kamińska-Szmaj, Wrocław 2002 (далей – SWO); W. Kopaliński, *Słownik wyrazów obcych i zwrotów obcojęzycznych z almanachem*, Warszawa 2007.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

зваляе вызначыць унутраны стан мовы і тэндэнцыі яе развіцця. Асабліва гэта датычыць сінхроннага этапу, на якім прагназаванне развіцця лексічнай сістэмы можа насіць толькі ўмоўны характар. Звычайна толькі моўная практыка здольная паказаць, якія з новых лексем замацуюцца ў слоўнікавым складзе.

Запазычванне ўяўляе сабой працяглы працэс ператварэння іншамоўных лексічных сродкаў у словы, падобныя спрадвечным. З фармальнага боку гэты працэс прадугледжвае фанетыка-графічнае, граматычнае і словаўтваральнае іх засваенне. Іншамоўныя словы пачынаюць выкарыстоўвацца для называння рэалій, уключаюцца ў сінанімічныя рады. Пры гэтым часта адзначаецца вар'іраванне іх матэрыяльнай формы, што праяўляецца ў ваганнях у вымаўленні, напісанні і акцэнтуацыі. Падобныя ваганні з'яўляюцца непазбежнымі, паколькі новыя запазычанні ўступаюць ва ўзаемадзеянне з лексікай мовы-рэцыпіента і паступова асімілююцца яе лексічнай сістэмай.

Трэба адзначыць, што для называння новых прадметаў і з'яў польская мова, у адрозненне ад беларускай, не так часта выкарыстоўвае прамыя запазычанні, а знаходзіць свае ўласныя адпаведнікі, напрыклад: бел. *прынтар* – польск. *drukarka,* бел. *ксеракс* – польск. *kopiarka / ksero,* бел. *кампакт-дыск* – польск. *płyta kompaktowa,* бел. *мабільны тэлефон / мабільнік* – польск. *telefon komórkowy / komórka*, бел. *браўзер* – польск. *przeglądarka / browser* і пад. Тым не менш, колькасць запазычанняў у наш час вельмі значная і ў польскай, і ў беларускай мовах, і праблемы пры іх адаптацыі існуюць таксама ў абедзвюх мовах.

Фанетыка-графічная адаптацыя

Фанетычная адаптацыя ўяўляе сабой паступовае прыстасаванне запазычанняў да асноўных заканамернасцей прымаючай моўнай сістэмы.[2] Праблемы пры фанетыка-арфаграфічнай адаптацыі запазычанняў звязаны з тым, што фанемныя склады розных моў адрозніваюцца і няма нейкай формулы ці закону, паводле якіх пэўныя фанемы адной мовы перадаюцца адпаведнымі ім фанемамі другой мовы. Хаця, безумоўна, нейкія тэндэнцыі можна прасачыць у кожнай канкрэтнай пары моў.

Трэба адзначыць, што пры запазычванні выкарыстоўваюцца транскрыпцыя, заснаваная на вымаўленні слова ў мове-крыніцы, або транслітарацыя, г.зн. арыентацыя на напісанне слова. Гэта, а таксама з'ява павышанай кантактнасці (г.зн. магчымасць запазычвання непасрэдна з мовы-крыніцы і праз пасрэдніцтва іншых моў), аналагічны ўплыў структурна аднародных варыянтных радоў, недастатковае засваенне слоў-паняццяў і інш. з'яўляюцца прычынамі існавання варыянтаў у напісанні іншамоўных слоў.

[2] Н. М. Даўгулевіч, *Фанетычная адаптацыя запазычанняў з англійскай мовы ў сучаснай беларускай мове: аўтарэф. дыс.* […] *канд. філал. навук*, Мінск 2003, с. 17.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

Арфаграфічная няўстойлівасць наогул з'яўляецца дадатковым паказчыкам іншамоўнага паходжання адпаведных слоў. Нават у сучасных літаратурных мовах з іх унармаваным правапісам арфаграфічным разнабоем характарызуюцца ў першую чаргу запазычаныя словы.[3]

У працэсе фанетычнай адаптацыі застаюцца толькі самыя істотныя прыметы гукаў. Запазычаная лексіка не ўтварае чужароднай падсістэмы, паколькі сэнсаадрознівальная функцыя гукаў мовы-крыніцы звужаецца толькі да тых адрозненняў, якія ёсць у мове-рэцыпіенце.[4] Для беларускай мовы характэрны такія цяжкасці пры фанетыка-арфаграфічным афармленні запазычанняў, як перадача цвёрдасці-мяккасці зычных на пісьме: бел. *дысплэй* / *дысплей, фітнес* / *фітнэс, менеджар* / *мэнэджар*; перадача іншамоўных зычных [d], [t] перад галосным [i]: бел. *бутык* / *буцік*, *джойстык* / *джойсцік, дыджэй* / *дзіджэй*; напісанне слоў разам або праз злучок: бел. *бізнес-вумен* / *бізнесвумен, джэк-пот* / *джэкпот, саўнд-трэк* / *саўндтрэк, флэш-моб* / *флэшмоб* і інш. Праблемы ў арфаграфічным афармленні выкліканы няўстойлівым вымаўленнем новых запазычанняў (або як у мове-крыніцы, або пад уплывам законаў мовы-рэцыпіента, або пад уплывам моў-пасрэдніц і пад.). Так, у англійскай мове адсутнічае супрацьпастаўленне зычных па цвёрдасці-мяккасці, у сувязі з чым узнікае пытанне іх адлюстравання ў беларускай мове. Для большасці новых запазычанняў падобнага тыпу характэрна цвёрдае вымаўленне зычных перад [э]. Аднак пад уплывам рускай мовы як мовы-пасрэдніцы ў беларускай мове часта выкарыстоўваецца літара *е*, што выклікае ў носьбіта мовы праблемы ў вымаўленні зычных (мякка ці цвёрда). (Хаця апошнім часам і ў рускай мове выяўляецца новая тэндэнцыя – захаванне цвёрдага вымаўлення ў новых запазычаных словах: *ти*[*нэ*]*йджер, ску*[*тэ*]*р, мо*[*дэ*]*м, тайб*[*рэ*]*йк.*[5]) Гэтую праблему, здаецца, павінны былі вырашыць новыя *Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі* (2008), дзе сказана, што „літара *э* ў запазычаных словах пасля губных зычных, а таксама пасля *з*, *с*, *н* пішацца згодна з літаратурным вымаўленнем".[6] Аднак „літаратурнае вымаўленне" ў адносінах да новых лексем застаецца неўнармаваным, а таму замацаванне напісанняў *бізнес, секс, менеджар, фітнес; інтэрфейс* (але *фэйс-кантроль), экстрасэнс* (але *сенсітыў*) у *Слоўніку беларускай мовы* (2012)[7] выклікае пытанні.

Да таго ж, колькасць запазычанняў у апошні час настолькі вялікая, што многія з іх проста не паспяваюць засвойвацца нават графічна. У папярэдні перыяд развіцця беларускай мовы напісанні лацінкай сустракаліся толькі як іншамоўныя ўкрапленні, г.зн. словы або выразы з якой-небудзь мовы, ужытыя білінгвальнай асобай у нязменнай або транслітараванай форме з пэўнай стылістычнай мэтай.[8]

[3] А. М. Булыка, *Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст.*, Мінск 1980, с. 217.
[4] Н. М. Даўгулевіч, *Фанетычная адаптацыя запазычанняў…*, с. 10.
[5] Л. П. Крысин, *1000 новых иностранных слов*, Москва 2009.
[6] *Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі*, Мінск 2008, с. 8.
[7] *Слоўнік беларускай мовы*, Мінск 2012 (далей – СБМ).
[8] *Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы*, рэд. А. Я. Баханькоў, Мінск 1994, с. 153.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

У наш час такія іншамоўныя ўкрапленні працягваюць выкарыстоўвацца (і вельмі актыўна), прычым сярод іх пераважаюць „модныя", жаргонныя словы, аднак побач з імі сустракаюцца графічна незасвоеныя лексемы, якія выконваюць не стылістычную, а перш за ўсё намінатыўную функцыю, называюць новыя рэаліі.

У выніку ў друку актыўна выкарыстоўваюцца лексемы ў напісанні лацінкай, як у мове-арыгінале, сярод якіх значную колькасць складаюць абрэвіятуры: бел. *bluetooth, e-mail, flash, hands free; CD, CD-RW, DVD, GPRS, GSM, ICQ, MMS, SMS* і інш. Паступова гэтыя лексемы пачынаюць адаптавацца беларускай мовай. Так, многія словы маюць варыянты ў напісанні кірыліцай, часам выкарыстоўваюцца адпаведныя ім апісальныя словазлучэнні: бел. *duty-free – дзьюці-фры, flash mob – флэш-моб, second-hand – сэканд-хэнд, hands free – хэндс-фры, e-mail – электронная пошта, product placement – ускосная рэклама* і пад.

Некаторыя шырокаўжывальныя абрэвіятуры таксама пачынаюць адаптавацца беларускай мовай: або шляхам расшыфроўкі (бел. *CD – кампакт-дыск*), або шляхам транскрыпцыі ці траслітарацыі кампанентаў абрэвіятуры (бел. *CD-ROM – сідзіром, PR – піяр; DVD – ДВД, MP3 – МП-3*). Параўн. таксама: *ICQ – жарг. Аська.*

Распаўсюджана новая моўная з'ява – камбінаванае (лацінкай і кірыліцай) напісанне складанасастаўных слоў, пры гэтым першая частка (звычайна абрэвіятура) у такіх лексемах пішацца лацінкай, другая – кірыліцай: бел. *CD-магнітола, CD-плэер; DVD-прайгравальнік, DVD-сістэма; GSM-апаратар, GSM-трубка; IP-адрас, IP-тэлефанія; IT-кампанія, IT-спецыяліст; SMS-банкінг, SMS-чат* і пад., прычым некаторыя з гэтых абрэвіятур становяцца базай для ўтварэння цэлага шэрагу вытворных. Цікава, што сярод падобных вытворных нярэдка сустракаюцца таўталагічныя ўтварэнні, дзе другая (кірылічная) частка з'яўляецца расшыфроўкай аднаго з элементаў абрэвіятуры першай (напісанай на лацінцы) часткі: бел. *CD-дыск* (літаральна: кампакт-дыск-дыск), *DVD-дыск* (лічбавы гібкі дыск-дыск), *IP-пратакол* (інтэрнэт-пратакол-пратакол), *IT-тэхналогіі* (інфармацыйныя тэхналогіі-тэхналогіі) і пад. Тым не менш, і такія лексемы пачынаюць адаптавацца графічна (абрэвіятура перадаецца кірыліцай): бел. *DVD-плэер – ДВД-плэер, SIM-картка – сім-картка.*

Асобна ў гэтым шэрагу стаяць лексемы з першай часткай *PR-*, што мае значэнне 'які надае папулярнасць; рэкламны': бел. *PR-агенцтва, PR-менеджар, PR-служба, PR-тэхналогія* і інш. Як яе адпаведнік актыўна ўжываецца частка *піяр-*, якая стала базай для ўтварэння новых слоў: бел. *піяр-акцыя, піяр-кампанія, піяр-служба, піяр-ход.* Аб засваенні лексемы *піяр* сведчыць наяўнасць вытворных: дзеяслова *піярыць* і назоўніка *піяршчык.*

Уяўляюць цікавасць лексемы, утвораныя ад іншамоўных абрэвіятур (у напісанні лацінкай) па словаўтваральных мадэлях беларускай мовы: бел. *PR-шчык, PR-ыць; SMS-ка, SMS-ны; MMS-ка.*

Праблемы пры фанетыка-графічнай адаптацыі новых запазычанняў існуюць і ў польскай мове. Часта запазычаныя лексемы захоўваюць арыгінальнае напісанне (як у мове-крыніцы). Пры гэтым вымаўляюцца яны таксама па

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

законах мовы-крыніцы, такім чынам, іх вымаўленне не супадае з напісаннем[9]: польск. *ecstasy* [ekstasi], *impeachment* [impiczment], *leasing* [lizing], *lycra* [lajkra], *transparency* [trensperensi], *zombie(s)* [zombi], а таксама абрэвіятуры *CV* [si-wi], *CD-ROM* [si-di-rom], *DVD* [di-vi-di], GPS [dżi pi es] і пад. Пры гэтым узнікаюць новыя, не характэрныя раней для польскай мовы з'явы. Напрыклад, новыя гукі, як мяккі *cz* [czipsy], або нетыповыя спалучэнні гукаў *ky* (*kynologia*), *ri* (z miękkim *r: ring*), *si, ci, dżi* (wymawiane twiardo: *pleksiglas, cito, dżingiel*).

Аднак нават арыгінальнае напісанне не пазбаўляе ад праблем у вымаўленні. Так, у некаторых выпадках розныя слоўнікі прапануюць розныя варыянты вымаўлення лексем, якія захоўваюць арыгінальнае напісанне: польск. *notebook* як [neutbuk] (SWO) і [noutbuk] (PWN), *snack-bar* – [snek-ba(r)] (SWO), [snakbar albo snekbar] (LNW), *image* – [im**aż** lub **i**midż], *show* – [szoł] і [szou] (LNW), *muesli / müsli* [musli, misli albo miusli] (LNW) і пад.

Частка лексем існуе ў варыянтных формах – неадаптаванай і адаптаванай да польскай фанетыка-арфаграфічнай сістэмы: польск. *clearing / kliring, gadget / gadżet, consensus, consens / konsensus, konsens, dealer / diler, outsider / autsajder* і пад. Пры гэтым „польскі" варыянт у такіх выпадках з цягам часу звычайна становіцца больш ужывальным і выцясняе неадаптаваны варыянт: *interfejs* (замест *interface*), *haker* (замест *hacker*), *meil* (замест *e-mail*), *czat* (замест *chat*).

Акцэнталагічная адаптацыя

Новыя запазычанні на першым этапе іх існавання ў мове звычайна ўяўляюць сабой пазасістэмную з'яву. Яны чужыя для мовы-рэцыпіента і часта захоўваюць націск мовы-крыніцы. Аднак паступова падобныя лексемы пачынаюць засвойвацца і пранікаюць у сістэму мовы, якая іх запазычыла.[10]

Такім чынам, ваганні ў акцэнтуацыі запазычаных слоў тлумачацца найперш ступенню іх засвоенасці. Націск можа захоўвацца на тым жа складзе, што і ў мове-крыніцы, ці перамяшчацца на наступныя склады. Пры гэтым націск з'яўляецца фактам маўлення, вар'іраванне ў дадзеным выпадку можа быць вельмі шырокім у розных носьбітаў мовы, адлюстроўваць узроставыя, лакальныя, прафесійныя, эмацыянальныя і інш. фактары[11], а таму вызначэнне нормы з'яўляецца вельмі складаным.

Тым не менш, праблемы пры вызначэнні націску сустракаюцца толькі ў некаторых лексемах, у пераважнай жа большасці запазычанняў ваганні ў акцэнтуацыі не выяўляюцца.

[9] K. Waszakowa, *Różnorodność i intensywność procesów przejmowania elementów obcych w słowotwórstwie współczesnej polszczyzny*, „Poradnik Językowy" 2001, z. 6, c. 5; A. Markowski, *Kultura języka polskiego. Teoria. Zagadnienia leksykalne*, Warszawa 2006.

[10] А. В. Суперанская, *Ударение в заимствованных словах в современном русском языке*, Москва 1968, с. 38.

[11] *Ibidem*.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

Асноўныя пытанні ў беларускай мове выклікае вымаўленне (а ў сувязі з гэтым і напісанне) некаторых англіцызмаў, якія ў мове-крыніцы з'яўляюцца складанымі словамі ці ўстойлівымі спалучэннямі, а таму могуць перадавацца разам або праз злучок, напрыклад: бел. *бізнес-вумен* і *бізнесвумен, бодзі-білдынг* і *бодзібілдынг, джэк-пот* і *джэкпот, кікбоксінг* і *кік-боксінг*. Адпаведна ў падобных словах існуюць праблемы ў вызначэнні месца націску, што выклікае наяўнасць некалькіх фанетыка-графічных варыянтаў, напрыклад: *сноўб'орд, сн'оўбард* і *снаўб'орд* (англ. *snowboard*).

Па аналогіі з беларускімі складанымі назоўнікамі ў такіх лексемах звычайна адбываецца перамяшчэнне націску на другую частку слова і ўзнікненне пабочнага націску ў першай частцы. У гэтым выпадку ў першай частцы захоўваецца нехарактэрны для беларускай мовы ненаціскны [о]: *бодзібілдынг, бойфрэнд, прома-тур* і пад. Прыведзеныя формы адлюстроўваюць навізну запазычанняў, іх можна разглядаць як ступень, якая не выключае ў далейшым замены ненаціскнога [о] на ненаціскны [а]. Тут можна прывесці лексемы *анлайн* (СБМ) і *афлайн* (СБМ), якія раней фіксаваліся ў трох варыянтах напісання: *он-лайн, онлайн, анлайн* (СНС); *оф-лайн, офлайн, афлайн* (СНС).

У польскай мове праблема акцэнталагічнай адаптацыі не мае такога маштабнага характару, бо націск звычайна прыпадае на перадапошні склад. Тым не менш, часта неадаптаваныя лексемы (якія захоўваюць арыгінальнае напісанне) вымаўляюцца па законах мовы-крыніцы (націск у такім выпадку можа прыпадаць не толькі на перадапошні, але на іншыя склады). Найперш гэта тычыцца запазычанняў з французскай мовы, якія захоўваюць націск на апошнім складзе: польск. *purée* [pür'e], *dosier* [dosj'e], *attaché* [atasz'e] і пад. Не на перадапошні склад можа прыпадаць націск у запазычаннях з іншых моў (найперш англійскай): польск. *developer* [diw'elepe(r)], *happening* [h'epening], *establishment* [est'abliszment], *remake* [rim'ejk], *ombudsman* ['ombudzmen] і інш. На апошні склад націск можа прыпадаць у лексемах (у тым ліку двухслоўных, якія вымаўляюцца як адно фанетычнае слова), якія ў англійскай мове з'яўляюцца ўстойлівымі выразамі: польск. *drive-in* [drajwin], *cover girl* [kawe(r) g'el], *come back* [kamb'ek], *high life* [haj l'ajf], *fair play* [fer pl'ej], *sex appeal* [seksepí:l] (пры наяўнасці варыянта ў напісанні *seksapil*) і інш.

Граматычная адаптацыя

Скланенне назоўнікаў

Запазычаныя назоўнікі і ў беларускай, і ў польскай мовах або застаюцца нескланяльнымі, або пачынаюць змяняцца па адным з тыпаў скланення.

Некаторыя з неадаптаваных лексем у польскай мове, нягледзячы на захаванне арыгінальнага напісання (як у мове-крыніцы), пачынаюць падпарадкоўвацца правілам змянення, характэрным для польскай мовы[12]: польск. *bluetooth*: *zasięg*

[12] K. Waszakowa, *op. cit.*, с. 6; A. Markowski, *Kultura języka polskiego…*, с. 144.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

bluetootha, PIN: ne podasz PIN-u, а таксама *skate – skejci, deweloper – dewelopera, deweloperzy; sms – smsa, mail – maila* і пад. Цікава, што ў фармальна двухслоўных назвах змяняецца толькі другое слова: польск. *do fitness clubu, mistrzowe hard rocka.*

Уяўляюць цікавасць і выпадкі, калі да напісанага лацінкай патэнцыяльна зменнага слова ў беларускай мове праз злучок, апостраф або ў дужках далучаецца склонавы канчатак у напісанні кірыліцай: *e-mail-ы блогераў, праграма эмуляцыі CD-ROM'а, поспехі з Word(ам).*

У беларускай мове дзякуючы запазычанням значна павялічылася колькасць так званых функцыянальных амонімаў – лексем, часцінамоўная прыналежнасць якіх вызначаецца аналітычна (яны могуць выконваць функцыі назоўніка, прыметніка і (даволі часта) прыслоўя). Тым не менш, тэматычна падобныя лексемы абмежаваны: у большасці выпадкаў гэта назвы стыляў папулярнай музыкі, літаратуры, адзення і пад., а таксама тэрміны інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі: *кантры, мілітары, нон-стоп, нон-фікшн, ню, анлайн, афлайн, рэгі, ска, стрэйч, хіп-хоп* і пад.

Паказчыкам засваення новых лексем з'яўляецца тэндэнцыя да разбурэння функцыянальнай аманіміі. Гэта можа адбывацца некалькімі шляхамі, але ўсе яны ўключаюць набыццё лексемай лексіка-граматычных уласцівасцей пэўнай часціны мовы. Напрыклад, словы, што выступаюць у сказе як назоўнікі, могуць атрымліваць адпаведныя марфалагічныя характарыстыкі, у прыватнасці пачынаюць скланяцца па адным з тыпаў скланення: *больш часу праводзяць у анлайне; усё, што звязана з хіп-хопам.* Увогуле большасць нескланяльных лексем, якія па знешняй форме нагадваюць назоўнікі мужчынскага роду (заканчваюцца на зычны), з'яўляюцца патэнцыяльна зменнымі. Нязменныя прыметнікі пры засваенні могуць набываць поўную форму – з суфіксам *-ав-*: *анлайнавы, афлайнавы, хіп-хопавы* і пад. Падобныя працэсы назіраюцца ў польскай мове: польск. *onlinowy*, *hip-hopowy, popowy, lightowy* і пад.

Род і лік нескланяльных запазычаных назоўнікаў

Пры ўжыванні нескланяльных запазычаных лексем у вуснай і пісьмовай мове адной з асноўных у беларускай мове з'яўляецца праблема аднясення іх да таго ці іншага роду. У выніку некаторыя іншамоўныя назоўнікі маюць варыянтныя граматычныя формы роду, што выклікана ўплывам розных аналогій (родавае найменне, уплыў мовы-крыніцы, мовы-пасрэдніцы і пад.). Напрыклад, бел. *біенале, трыенале*, *квадрыенале*: *Браціслаўскае біенале кніжнай ілюстрацыі*, *фестываль „Бонскі Б'енале"*, *прынялі ўдзел у Міжнародным трыенале інсітнага (наіўнага) мастацтва*, *прынялі ўдзел у міжнароднай выставе „Пражская квадрыенале-95"*, *удзел у міжнароднай выставе „Пражскае квадрыенале–95"*. Як вядома, большасць неадушаўлёных нязменных назоўнікаў адносіцца да ніякага роду.[13]

[13] *Беларуская граматыка*, Мінск 1985, ч. 1, с. 58; *Кароткая граматыка беларускай мовы*, Мінск 2007, ч. 1, с. 114.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

У мове-крыніцы (італьянскай) гэтыя словы адносяцца да жаночага роду. Існаванне варыянтаў у беларускай мове тлумачыцца ўплывам роду апорных слоў у словазлучэннях. Параўн. таксама: бел. *еўра* (м. і н.), *кабукі* (н. і м.), *судоку* (н. і ж.), *фэнтэзі* (ж. і н.), *экстазі* (м. і н.). У польскай мове падобныя хістанні не назіраюцца: неадушаўлёныя нязменныя назоўнікі, якія заканчваюцца на галосны, адносяцца да ніякага роду: польск. *euro* (н.), *biennale* (н.), *triennale* (н.), *safari* (н.), *sake* (н.), *wideo* (н.) і пад.

Назіраюцца ў беларускай мове хістанні і пры вызначэнні ліку іншамоўных нескланяльных назоўнікаў. Напрыклад, бел. *графіці* ўжываецца як назоўнік ніякага роду і – пад уплывам мовы-крыніцы – як множналікавы назоўнік: *прыгожае графіці*, *падгледзеў у вулічных графіці*. У польскай мове назоўнік *graffiti* адносіцца да ніякага роду. Параўн. таксама: бел. *мас-медыя* (толькі мн. і ж.), *мультымедыя* (толькі мн. і ж.) / польск. *mass media* (мн.), *multimedia* (мн.).

Цікавай з'явай з'яўляецца аднясенне да адзіночнага ліку назоўнікаў, якія ў мове-арыгінале з'яўляюцца множналікавымі: бел. *комікс* / польск. *komiks* (ад англ. *comics*, мн. ад *comic*), бел. *чыпсы* / польск. *czips* / *chips* (ад англ. *chips*, мн. ад *chip*), бел. *камандас* / польск. *komandos* (ад англ. *commandos*, мн. ад *commando*); параўн. таксама: польск. *girls* (ад англ. *girls*, мн. ад *girl*), польск. *krakers* (ад англ. *crackers*, мн. ад *cracker*) / але: бел. *крэкер* і пад.

Словаўтваральная адаптацыя

Новыя з'явы ў словаўтварэнні

Словаўтваральная адапатацыя запазычанняў таксама займае важнае месца ў абедзвюх мовах. У прыватнасці, яна праяўляецца ва ўзмацненні прадуктыўнасці іншамоўных афіксальных фармантаў і актывізацыі ўтварэння кампазітаў, у тым ліку па новых мадэлях, не тыповых для традыцыйнага славянскага словаўтварэння. Так, у беларускай і польскай мовах у апошнія дзесяцігоддзі назіраецца значная актывізацыя кампазітаў з першымі інтэрнацыянальнымі або запазычанымі кампанентамі: бел. *арт-, аўдыя-, аўта-, відэа-, вэб-, еўра-, кіна-, нарка-* і інш.: *арт-бар, арт-клуб; аўдыяальбом, аўдыязапіс; аўтабізнес, аўтаклуб; відэаамаматар, відэаапаратура; вэб-выданне, вэб-камера; еўразона, еўрапарламентарый; кінабізнес, кінапрацэс; наркабанда, наркагандаль;* польск. *auto-, cyber-, eko-, euro-, tele-, wideo-* і пад.: *automafia, autosklep; cybermiasto, cyberportret; ekosystem, ekopolityka; eurokampania, eurowybory; teleterapia, telewidownia; wideoimpreza, wideoklip* і г.д. Пры гэтым значная колькасць падобных лексем уяўляе сабой гібрыды, што складаюцца з першага іншамоўнага і другога славянскага кампанента.

Асаблівай увагі сярод такіх структур заслугоўваюць першыя кампаненты, якія заканчваюцца на зычны. Падобная мадэль (узорам для яе паслужылі англійскія структуры) раней была нехарактэрнай для польскай мовы, паколькі, у адрозненне ад беларускай, у ёй вызначальны кампанент знаходзіцца ў постпазіцыі да азнача-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

емага:[14] польск. *dostawa ekspresowa, muzyka jazzowa.* У польскай мове структуры з першым кампанентам, які заканчваецца на зычны, пачалі распаўсюджвацца ў СМІ толькі пасля 1989 г. Аднак апошнім часам колькасць такіх лексем павялічваецца, у сувязі з чым даследчыкі выказваюць меркаванне аб тым, што ў славянскіх мовах назіраецца рух словаўтварэння ў бок аналітызму.[15]

Нетыповай мадэллю для польскага словаўтварэння стала таскама ўтварэнне лексем з першай часткай *e-* (скарачэнне ад *electronic*) на ўзор лексемы *e-mail:* польск. *e-banking, e-business, e-commerce, e-firma, e-handel.*[16] У англійскай мове скарачэнні з падобнай будовай з'яўляюцца натуральнымі: *m-commerce (mobile commerce), m-phone (mobile phone), H-bomb (hydrogen bomb);* параўн. таксама *T-shirt* (футболка ў выглядзе літары „Т"). Для беларускай мовы такі спосаб утварэння лексем нехарактэрны, у ёй для выражэння адпаведнага значэння выкарыстоўваюцца лексемы з першымі часткамі *анлайн-* і *інтэрнэт-:* бел. *анлайн-выданне, анлайн-браніраванне; інтэрнэт-дзённік, інтэрнэт-партал* і пад. Выключэнне складае лексема *Т-шотка* (і яе варыянт – *цішотка*), якая выкарыстоўваецца ў мове СМІ і інтэрнэт-маўленні як адпаведнік англ. *T-shirt.*

Утварэнне новых слоў на базе новых запазычанняў

Важнай прыметай засвоенасці іншамоўнай лексікі з'яўляецца ўключэнне яе ў сістэму словаўтварэння мовы-рэцыпіента. Запазычанне можа трывала ўвайсці ў слоўнікавы склад мовы ў тым выпадку, калі становіцца базай для ўзнікнення новых слоў шляхам словаўтварэння або шляхам змены значэння.[17] Пры гэтым назіраецца пэўная заканамернасць: найбольш актыўна ўдзельнічаюць у словаўтваральным працэсе запазычаныя назоўнікі, а самым агульным і ўстойлівым словаўтваральным тыпам застаецца ўтварэнне на аснове назоўнікаў розных форм прыметнікаў.

Так, у беларускай мове прыметнікі ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў *-н-* і *-ав-:* бел. *афшорны, банерны, бартарны, гендарны, інсталяцыйны, масмедыйны, мультымедыйны* і інш.; *боўлінгавы, брэндавы, грантавы, дэмпінгавы, кансалтынгавы, лізінгавы, маркетынгавы* і інш. У сваю чаргу прыметнікі з суфіксам *-н-* могуць стаць базай для ўтварэння абстрактных назоўнікаў пры дапамозе суфікса *-асць*: *віртуальнасць*, *крэатыўнасць, сексапільнасць, эксклюзіўнасць* і інш.

---

[14] Е. А. Земская, *Новые явления в словообразовании русского и польского языков на рубеже XX–XXI веков*, [у:] *Новые явления в славянском словообразовании: система и функционирование: Доклады XI Междун. науч. конф. Комиссии по славянскому словообразованию при Международном комитете славистов, Москва, 24–26 марта 2009 г.*, Москва 2010, с. 214.

[15] Е. А. Земская, *op. cit.*, с. 218.

[16] A. Markowski, *Kultura języka polskiego…*, с. 116; K. Waszakowa, *op. cit.*, с. 10.

[17] А. М. Булыка, *op. cit.*, с. 228; А. А. Станкевіч, *Словаўтварэнне запазычанай лексікі ў беларускай і польскай мовах*, [у:] Беларуская мова, вып. 7, Мінск 1980, с. 123.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2026 16:52:01

Ад запазычанняў – назваў асоб па прафесіі або сферы дзейнасці ўтвараюцца прыметнікі пры дапамозе суфікса *-ск-*: *аўдытарскі, брокерскі, дылерскі, дыстрыб'ютарскі, рыэлтарскі, спонсарскі* і інш.

З дапамогай суфіксальнага і постфіксальнага спосабаў словаўтварэння магчыма таксама ўтварэнне дзеясловаў: *акцыянаваць (акцыяніраваць), дэфіліраваць, інсталяваць (інсталіраваць), кланіраваць, ксеракапіраваць, прэзентаваць – прэзентавацца, рацыраваць – рацыравацца, сертыфікаваць – сертыфікавацца, сканіраваць, спансіраваць* і пад.

Падобныя працэсы назіраюцца ў словаўтварэнні польскай мовы. Ад новых запазычанняў з дапамогай суфіксаў *-ow-* і *-n-* утвараюцца новыя прыметнікі; з дапамогай суфікса *-owa*(*ć*) або *-izowa*(*ć*) – дзеясловы; ад іх у сваю чаргу могуць утварацца назоўнікі з суфіксамі *-anie* / *-enie*: польск. *chip – chipowy, chipować, chipowanie; tuning – tuningowy, tuningować, tuningowanie; zapping – zappować, zappowanie, zapper;* а таксама *restrukturyzacja – restrukturyzacyjny, restrukturyzować; prywatyzacja – prywatyzować, prywatyzacyjny*.

Пры гэтым некаторыя з запазычанняў становяцца базавымі для цэлага рада лексем, напрыклад: бел. *камп'ютар – камп'ютарны, камп'ютаршчык, камп'ютарызаваць, камп'ютарызацыя, мікракамп'ютар, мінікамп'ютар, суперкамп'ютар, суперкамп'ютарны; спонсар – спонсарскі, спонсарства, спонсарша, спансіраваць, праспансіраваць, спансіраванне; прадзюсар – прадзюсарскі, прадзюсаваць / прадзюсіраваць, прадзюсаванне / прадзюсіраванне, саўнд-прадзюсар, супрадзюсар, тэлепрадзюсар; прэзентацыя – прэзентант, прэзентацыйны, прэзентаваць, прэзентавацца, прэзентаваны, відэапрэзентацыя, мультымедыяпрэзентацыя, выстава-прэзентацыя, самапрэзентацыя, флэш-прэзентацыя;* польск. *leasing – leasingować, wyleasingować, leasingowy, leasingodawca, leasingobiorca; sponsor – sponsorować, sponsorowanie, sponsorski; e-mail – e-mailować, zaemailować, emailowanie, e-mailowy, emailowiec; biznes – biznesowy, biznesmen, bizneswowen, bizneska, biznes partner* і пад.

Такім чынам, беларуская і польская мовы ў канцы XX–пачатку XXI ст. папоўніліся значнай колькасцю запазычанняў. Лексічныя працэсы ў гэтых мовах хоць і маюць агульныя рысы, але не з'яўляюцца аднолькавымі. Асаблівасці назіраюцца пры фанетыка-графічнай, граматычнай і словаўтваральнай адаптацыі новай запазычанай лексікі ў беларускай і польскай мовах. Іншамоўныя словы знаходзяцца на першапачатковым этапе засваення, і асаблівасці працякання гэтых працэсаў у кожнай з моў патрабуюць глыбокага лінгвістычнага даследавання.

Summary

The article is devoted to the problem of the new loan-words adaptation process in modern Belarusian and Polish. Main difficulties and specific features of phonetic-orthographic, grammatical and derivational adaptation are pointed out. The specificity of basic tendencies is detected and some characteristics of these processes are outlined.